# Фальшывая гісторыя – маці фальшывай палітыкі



**На мяжы другога і трэцяга тысячагоддзяў адбыўся кардынальны пералом у свядомасці многіх беларусаў. Здаецца, ужо большасць нашага народа ўсведамляе сябе асобнай нацыяй. Тое, пра што мроіў Купала, спраўдзілася: мы занялі пачэсны пасад між народамі, мы людзьмі завёмся. І паварот у мінулае, да канцэпцый «усходніх крэсаў Рэчы Паспалітай» або «заходняй ускраіны Расійскай імперыі», немагчымы. Гуртуе беларускі народ у нацыю не ідэя веры або мовы, а менавіта ўласная нацыянальная дзяржава.**
**Аднак у пачатку XX стагоддзя дамінаваў погляд, што беларусы – гэта найперш моўная, больш канкрэтна – беларускамоўная супольнасць. З гэтага пункту гледжання заўсёды зыходзілі дзеячы беларускага нацыянальнага адраджэння, а таксама гісторыкі, якія выйшлі з іх кола. На рубяжы XX і XXI стагоддзяў бадай усе аўтарытэтныя гісторыкі паволі або кардынальна пачалі крытыкаваць погляды адраджэнцаў. З'явіліся нават апалагеты некаторых ідэй заходнерусізму, польскага краёўства.**
**Беларуская гісторыя перастала ўяўляцца, мысліцца як беларускамоўная. Адпаведна стала цярпець крах адраджэнская гістарыяграфія. Паміранне міфаў, народжаных кагортай аўтараў – ад Вацлава Ластоўскага да Міколы Ермаловіча, дыягнаставаў доктар гістарычных навук з Магілёва Ігар МАРЗАЛЮК. Летась ён выдаў свайго кшталту медычнае заключэнне – манаграфію «Міфы «адраджэнскай» гістарыяграфіі Беларусі». Кніга накладам 100 экзэмпляраў атрымала водгук толькі ў асяроддзі прафесійных гісторыкаў. Але наступствы высноў спадара Марзалюка могуць быць большымі за акадэмічную дыскусію. Фактычна навуковец разбурыў не толькі міфы, але і паставіў крыж на канцэпцыі гісторыі бацькаўшчыны, сфарміраванай у XX стагоддзі. Калі прызнаць яго рацыю, давядзецца перапісваць падручнікі. Гэта стала нагодай для гутаркі з аўтарам манаграфіі аб праблемах, якія паставіла на парадак дня адраджэнская гістарыяграфія, – не толькі ў навуцы, але і ў палітыцы і ідэалогіі.**

**– Ігар Аляксандравіч, якія асноўныя ідэі складаюць адраджэнскую гістарыяграфію?**

– Тэрмін «адраджэнская гістарыяграфія» я ўжываю адносна брутальна прымардыялісцкай часткі нацыянальнага гісторыяпісання, прадстаўнікі якой сцвярджаюць, што беларусы існавалі ўжо ў IX–XIII стагоддзях, Вялікае княства Літоўскае перадусім «наша» дзяржава, а літоўцы там былі нечым другасным, нязначным, карацей – «малодшымі» братамі беларусаў. Эліта ВКЛ у эпоху Рэчы Паспалітай, паводле гісторыкаў, якія вызнаюць гэты «сімвал веры», працягвае захоўваць уласную нацыянальную (зразумела – беларускую) ідэнтычнасць, а выкарыстанне ёю пальшчызны – нібыта тое самае, што французскай мовы расійскім дваранствам. Польскія паўстанні на тэрыторыі Беларусі, ад Касцюшкі да Каліноўскага, для адраджэнскіх гісторыкаў – беларускія. А яшчэ для гэтай традыцыі характэрныя «песні жальбы» ды імкненне ўскласці адказнасць за ўсе няшчасці беларускага народа на «праклятых маскалёў». Чытаючы гэткія тэксты, міжволі складваецца ўражанне, што беларускі народ пасля падзелаў Рэчы Паспалітай трапіў у склад Расійскай імперыі не плебейскім этнасам з непаўнавартаснай сацыяльнай структурай, а квітнеючым гістарычным народам з уласнай высокай культурай. Для прадстаўнікоў гэтай традыцыі характэрны рамантызм, інтуітывізм, нястрыманая ідэалагізацыя і міфалагізацыя беларускага мінулага. Што праўда, гэта міфалогія мае выразна беларусафільскі характар, гэта «мана дзеля

ратунку», для якой характэрна імкненне да прыватызацыі чужой гісторыі і чужых гістарычных персанажаў (у першую чаргу літоўскіх і польскіх) з мэтай узвялічвання беларускага мінулага.

Ёй процістаіць не менш шкодная беларусафобская, антыбеларуская, антынацыянальная міфалогія. Для яе носьбітаў характэрны комплекс нацыянальнай мізэрнасці, Беларусі і беларускага народа ў іх уяўленнях як нацыянальных катэгорый не існуе да сёння, як нібыта не існуе і беларускай самабытнай гісторыі і мовы. Пад пяром такіх даследчыкаў беларуская гісторыя выглядае з дакладнасцю наадварот: беларусы нібыта толькі і марылі ўсё сваё мінулае аб адным – як хутчэй трапіць у склад Расіі, а ўплыў Расіі заўсёды быў быццам бы пазітыўным і гаючым.

На самай справе ўсё было куды больш складана, чым здаецца міфолагам. Беларуская гісторыя далёка не калька гістарычнага мінулага сваіх суседзяў як з Усходу, так і з Захаду. Гісторыя Беларусі – гэта яшчэ і гісторыя ўзаемных культурных уплываў у кніжнай справе і кнігадрукаванні, грамадскай і сацыяльна-палітычнай думцы паміж намі і нашымі суседзямі з поўначы, поўдня, захаду і ўсходу Еўропы, гэта і процістаянне ўнутры беларускай інтэлектуальнай прасторы паміж рознымі групоўкамі, спачатку літоўскафільскімі і масквафільскімі, потым паланафіламі і русафіламі. У змаганні паміж імі пакутліва і доўга нараджалася тое, што мы сёння называем беларускай ідэяй – права на ўласную нацыянальную самабытнасць і нацыянальную дзяржаўнасць. Калі беларускі нацыянальны гісторык нешта хоча зразумець у сваім мінулым, адэкватна наблізіцца да гістарычнай рэчаіснасці, то ён абавязаны разглядаць беларускую гістарычную палітру ва ўсёй яе разнастайнасці, услухацца ў матывацыю ўчынкаў сваіх далёкіх продкаў, а не накідваць ім уласныя ўяўленні. Гісторык-міфолаг палітызуе і мадэрнізуе гістарычнае мінулае і замест навуковых прац стварае псеўдагістарычныя агіткі на злобу дня дзеля абслугоўвання той ці іншай палітычнай плыні, партыі, руху. Да чаго гэта, урэшце, прыводзіць? Да інтэлектуальнай прастрацыі ў свядомасці часткі грамадства, страты рацыянальнага ўсведамлення палітычнай элітай таго, якая рэальная гістарычная спадчына ёсць у народа, а значыць, і таго, якія памкненні, што вынікаюць з гістарычнай традыцыі, уласцівы для гэтага народа ў сённяшнім дні. Ігнараванне палітычнай элітай рэальнай гістарычнай традыцыі свайго народа прыводзіць у выніку толькі да аднаго – да палітычнага банкруцтва і дыскрэдытацыі нацыянальнай ідэі ў грамадстве. Фальшывая гісторыя – маці фальшывай палітыкі. Ці ж трэба для гэтага лепшы доказ, чым параза Беларускага народнага фронту «Адраджэнне», які ў свой час паблытаў Беларусь з Вялікім княствам Літоўскім? Гэта назіранне зрабіў не я, а гісторыкі з Беластока Яўген Мірановіч і Алег Латышонак. Як кажуць, без каментарыяў.




Шэсце ўдзельнікаў Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур у Гродне. Чэрвень 2010 года

**– Дарэчы, ідэя, што ВКЛ – гэта беларуская дзяржава, не новая. Хто сфарміраваў базу для такіх уяўленняў?**

– Гэтая ідэя была выразна сфармулявана яшчэ ў XIX стагоддзі гісторыкамі заходнярускай школы беларускай гістарыяграфіі (найперш М. Каяловічам), а таксама расійскай гістарыяграфіі (М. Устралаў, І. Бяляеў, П. Бранцаў, М. Любаўскі) і кіеўскай школы ўкраінскай гістарыяграфіі (М. Пятроў, І. Малышэўскі, М. Кастамараў, У. Антановіч, В. Данілевіч). Але крыніцы названых гістарыяграфій яшчэ больш глыбокія. Напрыклад, калі гаварыць пра міф аб тым, што нібыта полацкія князі заснавалі Вялікае княства Літоўскае і быццам бы менавіта полацкая дынастыя запанавала ў Літве,

НАША ДАСЬЕ

МАРЗАЛЮК Ігар Аляксандравіч.

Нарадзіўся ў 1968 годзе ў г.п. Краснаполле Магілёўскай вобласці. У 1992 годзе скончыў Магілёўскі педагагічны ўніверсітэт (з 1997 года – Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. Куляшова), дзе з 1996 года выкладае.

Доктар гістарычных навук (2004).

Аўтар шматлікіх навуковых манаграфій і артыкулаў. Даследуе матэрыяльную і духоўную культуру Магілёва і іншых гарадоў Беларусі эпохі феадалізму. Працы апошняга часу прысвечаны аналізу этнаканфесіянальных і сацыякультурных стэрэатыпаў жыхароў сярэдневяковай Беларусі.

а значыць, і ВКЛ з'яўлялася ні больш ні менш як працягам полацкай, славянскай, беларускай дзяржаўнасці, то першым, хто такое пачаў сцвярджаць, быў «беларускі нацыяналіст» XVI стагоддзя маскоўскі цар Іван IV Грозны. Было гэта ў час барацьбы Маскоўскай дзяржавы з Літоўскай за ўсходнеславянскія землі. У 1562 годзе маскоўскія прадстаўнікі заяўлялі літоўцам: «Только вспомнить старину, каким образом гетманы литовские Рогволодовичей Данила да Мовкольда на Литовское княжество взяли и каким образом великому государю Мстиславу Владимировичу Мономашу к Киеву дань давали, то не только что Русская земля вся, но и Литовская земля вся – вотчина государя нашего». Гэта ідэалагема ўвайшла ў познія летапісныя зводы Маскоўскай дзяржавы, з якіх у XIX стагоддзі была запазычана спачатку Тэадорам Нарбутам, а ад яго Восіпам Турчыновічам, большасцю гісторыкаў заходнярускай плыні, палона-літвінам Адамам Ганорыем Кіркорам, ды пастаянна паўтаралася і агучвалася ў прадмовах да выданняў Віленскай археаграфічнай камісіі, створанай, як вядома, пры генерал-губернатару Міхаілу Мураўёву. Гэта легенда апошні раз была рэанімавана і паднята на шчыт у выглядзе «схаванай ад нашага народа праўды» ў працах гісторыка-аматара Міколы Ермаловіча. Ідэйныя вытокі трактоўкі ВКЛ як беларускай дзяржавы таксама трэба шукаць у творчасці ўніяцкай прафесуры Віленскага ўніверсітэта: М. Баброўскага, І. Даніловіча, Я. Ярашэвіча і П. Сасноўскага. Пры вывучэнні гісторыі і культуры Літвы апошнія выразна вылучалі ды падкрэслівалі славянскі, рускі элемент у гэтай дзяржаве. Уніяцкая віленская прафесура з гонарам падкрэслівала культуртрэгерскую ролю ўсходнеславянскага, рускага элемента ў справе далучэння Літвы да цывілізацыі, бо мовай культуры, дзяржавы і права ВКЛ была руская. Баброўскі ды іншыя марылі пра вяртанне ў грамадскае жыццё Заходняй Русі даўняй дзяржаўнай мовы ВКЛ, мовы літоўскіх статутаў. У 1839 годзе М. Устралаў выдаў працу «Исследование вопроса, какое место в русской истории должно занимать княжество Литовское». Гэты даследчык упершыню ўвёў у навуковы дыскурс расійскай гістарыяграфіі азначэнне «літоўска-руская дзяржава» ў



Мікалай Герасімавіч Устралаў



Ігнат Мікалаевіч Даніловіч



Мікола Іванавіч Ермаловіч

дачыненні да ВКЛ. Азначэнне гэта потым выкарыстоўвалі бадай усе дарэвалюцыйныя гісторыкі. Паводле М. Устралава, Заходняя Русь стварыла сваю дзяржаву ў выглядзе ВКЛ са сталіцай у Вільні, іншай жа ўсходнеславянскай дзяржавай, яе сапернікам у справе збірання рускіх зямель была Русь Маскоўская. У падрыхтаваным і выдадзеным у 1836 годзе ў Маскве «Сборнике Муханова» сцвярджалася, што ў былым Вялікім княстве Літоўскім дамінавала рускае насельніцтва і руская мова, а літоўцы складалі толькі 1/10 ад усіх жыхароў. Такім чынам, Літва выглядала як руская краіна і руская дзяржава ў мінулым. Далейшае развіццё гэтай тэорыі знайшло адлюстраванне ў прадмове да археаграфічнага выдання «Собрание грамот и актов городов Вильно, Ковно и Трок», якое пабачыла свет у Вільні ў 1843 годзе. Менавіта тут былі надзвычай выразна сфармуляваны погляды на ўзаемадачыненні паміж усходнімі славянамі і літоўцамі. У прадмове да выдання яго аўтары сцвярджалі, што вялікая колькасць літоўцаў першапачаткова прыняла праваслаўнае хрышчэнне, асімілявалася і стала рускімі, што большасць знакамітых княжацкіх і магнацкіх родаў ВКЛ першапачаткова вызнавалі праваслаўе, а значыць, былі рускімі. Больш за тое, аўтарамі было сказана, што быццам бы ў літоўскай мове 2/3 слоў славянскія і 1/3 фінскія, гоцкія, нямецкія, а значыць, і асобнай літоўскай мовы ў прыродзе не існуе ўвогуле. Такім чынам, беларускі нацыянальны рух атрымаў ад заходнярусаў гатовую гістарыяграфічную канцэпцыю з «вялікім» беларускім мінулым, «уласнай» дзяржавай ВКЛ.

**– Хто з названых Вамі персанажаў можа лічыцца бацькам беларускай адраджэнскай гістарыяграфіі?**

– Мабыць, гэта Восіп (Цэзар) Вікенцьевіч Турчыновіч, які ў 1857 годзе выдаў сваё «Обозрение истории Белоруссии». З таго часу і павінна адлічвацца вывучэнне гісторыі Беларусі як прадмета даследавання. Але праца Турчыновіча з'явілася не на пустым месцы. У першай палове XIX стагоддзя адбываецца назапашванне ведаў пра беларусаў – іх этнаграфію і мову. Прычым вывучэннем беларусікі ў той перыяд пачалі займацца і польскія вучоныя, і расійскія, і краёвыя. У той час ніхто

ўжо асабліва не сумняваўся, што беларусы, як этнаграфічная катэгорыя, існуюць. Іншая справа – адны беларусаў і Беларусь лічылі састаўной часткай Польшчы, польскага народа, другія – Расіі, этнаграфічнай групай рускага народа. Яшчэ ў 1803 годзе шляхціц з-пад Пінска польскі гісторык Адам Нарушэвіч у другім томе сваёй «Гісторыі польскага народа» сцвярджаў, што палачане былі цалкам адрознымі ад іншых рускіх і мелі сваю ўласную дынастыю да часоў княжання Уладзіміра Святога, які забіў іх князя Рагвалода, захапіў у палон яго дачку і княства. Польскі гісторык рабіў акцэнт на самастойнасці Полацкай зямлі ад Кіеўскай Русі. З гэтай жа думкай пагаджаўся і польскі гісторык Іахім Лялевель. Выдатны расійскі гісторык Мікалай Карамзін таксама пісаў пра тое, што полацкія князі здаўна жылі самастойным жыццём. Але толькі Турчыновіч здолеў зрабіць сістэмны выклад менавіта беларускага мінулага, напісаў гісторыю Беларусі як асобнага суб’екта гістарычнага працэсу. І што цікава: хоць Турчыновіч разважаў цалкам у духу заходнерусізму, сам быў выхадцам з каталіцкай шляхты. Але яшчэ большым заходнярусам быў магілёўскі каталіцкі арцыбіскуп Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч, гарачы прыхільнік Кацярыны II, з ласкі якой ён і стаў кіраўніком каталіцкага касцёла ў Расійскай імперыі. У сваёй працы «O Rossyi Zachodniej» арцыбіскуп пісаў, што беларусы, маларусы і велікаросы складаюць адзін рускі народ. Як бачыце, важнейшая канцэптуальная падстава заходнерусізму была сфармулявана не велікаросам, нават не праваслаўным беларусам, а каталіцкім арцыбіскупам. Апошні, дарэчы, быў дзядзькам Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

**– Вы сказалі, што фальшывая гісторыя нараджае фальшывую палітыку. З якога часу пачалі фармулявацца беларускія палітычныя ідэі і што ў іх ад пачатку было праўдай, а што самападманам?**

– Назваць прозвішчы двух першых беларускіх палітыкаў цяжкасці не складае – гэта студэнты Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта, нарадавольцы, заснавальнікі часопіса «Гомон» (1884) – шклоўскі мешчанін яўрэй Хаім Ратнер і мсціслаўскі мешчанін праваслаўны беларус Аляксандр Марчанка. Менавіта народнікі, выдаўцы «Гомона», стварылі першую палітычную праграму ў дачыненні да Беларусі, першымі абгрунтавалі яе права на нацыянальную дзяржаўнасць (у выглядзе аўтаноміі ў складзе Расіі), сцвярджалі, што беларусы – цалкам самастойны славянскі народ, а не галіна ці састаўная частка якой-небудзь іншай нацыянальнай супольнасці. Услухаемся ў іх заклік, які можна без перабольшання назваць першым нацыянальным беларускім маніфестам: «Долой эксплуатацию, мы сами желаем управлять собой! Долой чужие руки, Белоруссия должна быть для белорусов, а не для чуждых элементов! Довольно нам подчиняться сильнейшим и ждать, куда они нас поворотят – направо или налево!.. Мы сами должны завоевать себе свободу, не возлагая надежды на других!»

Тытульны ліст кнігі «Обозрение истории Белоруссии» Восіпа Турчыновіча. 1857 год




Тытульны ліст першага тома кнігі «Skarbiec diplomatów» Ігната Даніловіча. 1860 год




Вокладка першага нумара часопіса «Гомон». 1884 год




**– А як жа Францішак Багушэвіч, якога некаторыя даследчыкі лічаць бацькам беларускага адраджэння?**

– Што да Багушэвіча, то я не сумняваюся, што яго персанажы Мацей Бурачок і Сымон Рэўка з-пад Барысава – гэта беларусы па нацыянальнасці. Прадмова да «Дудкі беларускай», безумоўна, мела беларускі характар, сцвярджала культурную, моўную самастойнасць беларускага народа, існаванне ў мінулым уласнай гістарычнай традыцыі. Аднак ніводнага слова аб нацыянальнай будучыні, аб праве беларусаў на самастойную дзяржаўнасць у хоць якой форме Багушэвіч не сфармуляваў. І ўвогуле, ці лічыў сам Багушэвіч сябе беларусам? Факты не даюць станоўчага адказу на гэта пытанне, бо пан Францішак і падпольныя польскія школы адкрываў, і за правы польскай мовы змагаўся, і большасць сваіх твораў напісаў па-польску. У тэксце, напісаным у 1885 годзе для польскага часопіса «Kraj», што выходзіў у Санкт-Пецярбургу, Багушэвіч назваўся літвінам. А вось знайсці хоць бы адну згадку, хоць бы адну дакументальную крыніцу, у якой Францішак Багушэвіч акрэсліў сябе беларусам па нацыянальнасці, ніхто так і не здолеў. Так што тут ёсць поле для палемікі. Тым больш што Аляксандр Ельскі ў сваім артыкуле «Беларуская літаратура і бібліяграфія» (1892) без усялякіх ваганняў адносіў паэта да польскіх літаратараў, якія адно што пісалі па-беларуску.

**– Сярод міфаў айчыннай гісторыі, што датычацца паходжання народа, папулярныя два. Адзін сцвярджае, што беларусы – найчысцейшыя славяне, другі гаворыць, што мы – балты. Як каментуе гэтыя процілеглыя сцверджанні сучасная навука?**

– Гэта не чыстыя фантазіі. Нагадаю, любы міф – спалучэнне рацыянальных ведаў і ірацыянальных жаданняў і тлумачэнняў фактаў яго творцамі. Падставы для такой міфалогіі сапраўды ёсць. На сённяшні дзень, дзякуючы даследаванням беларускіх археолагаў А. Егарэйчанкі і В. Вяргей, даказана, што самыя раннія комплексы бясспрэчна славянскай пражскай культуры знаходзяцца на нашым беларускім Прыпяцкім Палессі – па радыевугляродных паказчыках гэтыя помнікі датуюцца IV стагоддзем. Цяпер гэта самыя старажытныя славянскія помнікі ў свеце. Калі гэта так, то славянская мова загучала ўпершыню на землях паўднёвай Беларусі. Праўда і тое, што Верхняе Панямонне і Беларускае Падзвінне – гэта тыя землі, што былі заселены балтамі не толькі ў эпоху ранняга жалезнага веку, але часткова і ў раннім сярэднявеччы. Ніхто з даследчыкаў не аспрэчвае той факт, што культура штрыхаванай керамікі і днепрадзвінская культура – культуры балцкія. Тое самае датычыцца і ятвяжскіх помнікаў, і культуры ўсходнелітоўскіх курганоў паўночна-заходняй Беларусі. Тут славянская каланізацыя сутыкнулася з балцкай стыхіяй, што істотна паўплывала і на антрапалогію, і на фальклор, і на матэрыяльную культуру нашых продкаў. Адмаўляць гэта таксама марна. Гэта факт. Таму тэорыя пра балцкі субстрат як адзін з найважнейшых вызначальных фактараў, што паўплываў на працэс фарміравання асобнай этналінгвістычнай усходнеславянскай беларускай супольнасці, асобнай усходнеславянскай мовы, якая цяпер называецца беларускай, таксама мае поўнае права на навуковае жыццё. Бо гэта тэорыя, сфармуляваная маскоўскім археолагам Валянцінам Сядовым, грунтуецца на вялікай крыніцазнаўчай базе. Іншая справа, што ёсць у гэтай тэорыі таксама і спрэчныя моманты, ёсць і памылковыя сцверджанні, але ў цэлым яна працуе.

**– Паводле яшчэ аднаго міфа, беларусы – гэта літвіны. Што стала падставай для такога погляду?**



Жаночыя ўпрыгожанні, характэрныя для пражской культуры, знойдзеныя на Зімноўскім гарадзішчы (Украіна)

– Мы – беларусы. Гэта значыць, што большая частка з нас (праваслаўных і былых уніятаў) з'яўляецца нашчадкамі ўсходнеславянскай Русі, старажытных рускіх, русінаў, меншая ж – нашчадкамі літоўцаў, літвінаў, рыма-каталікоў, першапачаткова балтамоўных, якія яшчэ ў XIV–XVI стагоддзях былі складнікам літоўскай, балцкай этнічнай супольнасці. Гэтыя літвіны з часам сталі славянамоўнымі (беларускамоўнымі). Гэтак сфарміравалася пераходная этнічная група, якая выраклася сваіх балтамоўных продкаў і стала па свядомасці ці палякамі (большасць), ці беларусамі. Таму літоўска-каталіцкая традыцыя не чужая нам, беларусам. Адам Мальдзіс – сапраўдны беларус, пры гэтым каталік, а яго дзед яшчэ быў балтамоўны, літоўскамоўны. І такіх сярод нас, беларусаў, дастаткова: людзей з нацыянальнай беларускай свядомасцю, каталіцкай ідэнтычнасцю і літоўскімі каранямі. Іншае пытанне – стварэнне міфа пра літвінаў-беларусаў, якія нібыта не маюць ніякага дачынення да ўласна літоўцаў. Але ў гэтым мы не піянеры міфатворчасці. Гэткія міфалагемы ўзнікалі ў многіх плебейскіх народаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў часы іх нацыянальнага абуджэння. Класічны прыклад – славакі. Дзеячы славацкага нацыянальнага руху першай паловы XIX стагоддзя ўсведамлялі сябе хунгарамі (народам, радзімай якога была Венгрыя – Хунгарыя), але не мадзьярамі. Такім чынам, як беларускія гісторыкі імкнуліся проціпаставіць нібыта «славянскую», «беларускую» Літву і літвінаў балцкай «Летуве» і «летувісам», так і славакі – яшчэ раней за беларусаў – ажыццявілі ў сваім гісторыяпісанні аналагічнае вынаходніцтва. Мэта і ў першым, і ў другім выпадках была адна – стварыць уяўны гістарычны кантынуітэт з нібыта «сваім» вялікім гістарычным мінулым, «скрадзеным» падступным суседам, ды такім чынам легітымізаваць правы свайго народа на нацыянальную дзяржаўнасць у сучаснасці. Падобным чынам развязалі пытанне з існаваннем дзяржаўнасці ў мінулым і ідэолагі нацыянальнага руху

македонскіх славян, якія прыватызавалі гісторыю антычнай Македоніі з царом Філіпам і яго знакамітым сынам Аляксандрам Македонскім уключна ў якасці «нацыянальных», «славянскіх», македонскіх герояў.

**– Дзе ж вытокі нашай дзяржаўнасці, самастойнасці?**

– Вытокі нашай дзяржаўнасці ва ўсходнеславянскіх княствах Кіеўскай Русі і найперш у Полацкім, а таксама Тураўскім, Смаленскім і Галіцка-Валынскім. Вялікае княства Літоўскае таксама нам не чужое. Без нашых продкаў-русінаў яно не стала б вялікім, а без іх падтрымкі ніколі не праіснавала б так доўга як самастойная дзяржава. Іншая справа – былі памкненні стварыць Вялікае княства Рускае ў XIV–XV стагоддзях, але рускі сепаратызм так і не стаўся рэальнасцю менавіта з-за зацікаўленасці ў захаванні ВКЛ не толькі літоўскіх нобіляў, але і нашых, рускіх, для якіх Вільня стала сталіцай замест Кіева, Полацка і іншых старажытнарускіх цэнтраў. Ні Полацк, ні Смаленск не здолелі на роўных канкурыраваць з Вільняй. Таму рускае баярства стаяла насмерць і на Ведрашы, і на Крапіўне, зацята бараніла свае замкі і гарады ў час няспынных маскоўска-літоўскіх войнаў XVI стагоддзя. Праваслаўнай знаці, баярству, духавенству і мяшчанству быў уласцівы літоўскі дзяржаўны патрыятызм. Усё змянілася ў Рэчы Паспалітай, але толькі ў XVIII стагоддзі, калі і літоўцы, і нашы продкі амаль дарэшты страцілі ў выніку татальнай паланізацыі ўласную эліту і мяшчанства.



Помнік Адаму Міцкевічу ў Мінску

**– Ці могуць Адам Міцкевіч і Тадэвуш Касцюшка, нягледзячы на іх польскую нацыянальную свядомасць, лічыцца беларусамі?**

– І Адам Міцкевіч, і Тадэвуш Касцюшка, а таксама Станіслаў Манюшка, Напалеон Орда (можна яшчэ шмат прозвішчаў назваць) – нашы славутыя землякі. Паўтаруся: землякі, але не беларусы па нацыянальнасці. Не адчувалі яны сябе беларусамі, ніхто іх беларусамі пры жыцці не лічыў, і самі сябе яны да беларускага народа ніколі не адносілі. На «краёвым» (рэгіянальным, субэтнічным) узроўні лічылі сябе літвінамі, а на нацыянальным – палякамі. Іх паняцце нацыянальнасці нічым прынцыпова не адрознівалася ад мадэрнага азначэння нацыянальнасці, сфармуляванага ў французскай традыцыі эпохі Асветніцтва. Грамадзянства для іх і было нацыянальнасцю. Таму для прыхільніка такой канцэпцыі і брэтонец, і баск, і карсіканец – такія самыя французы, як і жыхар Іль-дэ-Франса. Усе яны маюць параметры калектыўнай ідэнтычнасці: павінны ведаць і карыстацца адзінай літаратурнай і дзяржаўнай мовай, захоўваць адны законы і ўяўляць сваё мінулае з франкацэнтрычных (у нашай сітуацыі двухвекавой даўнасці – польскацэнтрычных) пазіцый. У Рэчы Паспалітай XVIII стагоддзя, у эпоху Асветніцтва, працэсы нацыяўтварэння ішлі такім жа шляхам, што і ў Францыі, дзе ўпершыню на еўрапейскім кантыненце (пасля Вялікай французскай рэвалюцыі) была створана «палітычная» грамадзянская мадэрная нацыя. Пры канцы існавання Рэчы Паспалітай у дачыненні да ВКЛ, як правіла, скарыстоўваўся тэрмін «Літоўская правінцыя», уся ж дзяржава звычайна называлася Польшчай. Ужыванне тэрміна «літвін» тады не мела значэння нацыянальнага проціпастаўлення; гэта была ўсяго толькі назва рэгіянальная, субэтнічная ў межах адзінай айчыны – Польшчы. Пры гэтым палона-літвіны ведалі пра існаванне нашага народа, народа беларускага, але сябе з ім ніколі не атаясамлівалі. Ды і не верылі яны ў магчымасць самастойнага развіцця беларусаў. Тадэвуш Касцюшка, безумоўна, выдатны дзеяч Рэчы Паспалітай. Але ён – гонар і слава польскай нацыі, давайце будзем шчырымі самі перад сабой. Аб якой долі ён марыў для беларускага народа, для сваіх сялян-русінаў? Адказ на гэта пытанне няцяжка знайсці ў перапісцы Касцюшкі з Гуга Калантаем. Дык вось, «наш» нібыта «беларус» марыў аб татальнай паланізацыі (моўнай і ментальнай) нашага народа: «Прывучыць іх (русінаў. – **І.М.**) трэба да польскай мовы... З часам польскі дух у іх увойдзе. Непрыяцелем лічыць будуць потым таго, хто не будзе гаварыць на нацыянальнай мове». Цяпер наконт Адама Міцкевіча. Нідзе ў яго не знойдзем атаясамлення ўласнай традыцыі з беларускім народам, з беларускай гісторыяй. Яго гісторыя – гэта гісторыя балцкай Літвы,

якая стварыла ВКЛ і добраахвотна злучылася з Польшчай праз Люблінскую унію. Нельга ўспрымаць іначай, як недарэчны жарт, прэтэнзіі асобных адраджэнскіх беларускіх гісторыкаў на «беларусізацыю» ды «прыватызацыю» Міцкевіча і, больш за тое, сцверджанні аб яго беларускасці, меркаванні, што ён нібыта быў «нашым» паэтам. На самай справе Міцкевіч не проста ўсведамляў сваю нацыянальную польскасць (што не перашкаджала яму мець рэгіянальную, субэтнічную, літоўскую свядомасць), а з'яўляўся адным з творцаў мадэрнага польскага нацыяналізму, абгрунтоўваў канцэпцыю польскага каталіцкага месіянства, даводзіў богаабранасць палякаў як народа-пакутніка. Яго Польшча – гэта і ўласна этнічная Польшча (Карона), і Літва, і Русь, «ад мора да мора». Ёсць у Адама Міцкевіча і вобраз Беларусі, беларускага народа і яго мовы. Але гэты вобраз не надта прыемны. Беларусы для Міцкевіча – народ без традыцый уласнай дзяржаўнасці, народ негістарычны, пазбаўлены ўласнай суб'ектнасці, народ татальна залежны ад сваіх суседзяў на працягу ўсёй уласнай гісторыі. Для Міцкевіча і беларуская, і ўкраінская, і велікаруская мовы – складнікі агульнарускай моўнай стыхіі. Паводле паэта, усе яны бяруць удзел у стварэнні агульнарускай літаратурнай мовы, і толькі дзякуючы М.В. Ламаносаву верх над беларускай і ўкраінскай мовамі ў працэсе стварэння новай літаратурнай рускай мовы атрымлівае велікаруская стыхія. Міцкевіч пісаў: «На беларускай мове, якую называюць рускай, або літоўска-рускай, размаўляе каля дзесяці мільёнаў чалавек; гэта самая багатая і самая чыстая гаворка, яна ўзнікла даўно і цудоўна распрацавана. У перыяд незалежнасці Літвы вялікія князі карысталіся ёю для сваёй дыпламатычнай перапіскі. Мова велікаросаў, на якой гавораць амаль гэтулькі ж чалавек (трэба выключыць адсюль фінска-маскоўскі дыялект, які моцна ад яе адрозніваецца), вылучаецца багаццем і чысцінёй, але ў яе няма ні цудоўнай прастаты беларускай мовы, ні гарманічнасці і музычнасці маларускай. У Пецярбургу часоў Ламаносава змяшаліся ўсе гэтыя мовы, а да іх дадалася і стараславянская мова. Невядома было, якой з гэтых моў аддаць перавагу і прыняць у якасці агульналітаратурнай мовы. Ламаносаў, які нарадзіўся на беразе Белага мора, паходжаннем велікарос, аддаў першынство сваёй роднай мове». Ну, і як вам падабаецца вобраз самабытнасці і самастойнасці Беларусі ў мінулым ад Адама Міцкевіча? Але практычна ўсе шляхецкія інтэлектуалы былога ВКЛ у першай палове XIX стагоддзя мелі такую самую свядомасць і аналагічна глядзелі на беларусаў. У 1840 годзе ў Парыжы эмігрант з Беларусі, родам з Віцебшчыны, удзельнік шляхецкага паўстання 1830 – 1831 гадоў Аляксандр Рыпінскі выдаў на польскай мове працу «Беларусь. Колькі слоў пра паэзію простага люду гэтай нашай польскай правінцыі, пра яго музыку, спевы, танцы, etc.». Вельмі паказальная і сама назва, і прысвячэнне, якое даў да свайго тэксту аўтар: «Першаму з беларускіх сялян, які найперш чытаць, а пасля гаварыць і думаць па-польску навучыцца, гэту маю нікчэмную працу на доказ высокай любові і павагі прысвячаю і дзеля яго друкую». Тэкст брашуры яшчэ больш красамоўны. Рыпінскі піша, што «Белая Русь, наколькі яна ёсць і будзе польскаю, складае непадзельную частку нашай дарагой Айчыны... Жыве тут просты народ славянскага племя, здавён шчыльна звязаны з сям'ёй ляхаў, сумленны, але ўбогі ды мала вядомы нават уласнай Айчыне яго, Польшчы, хоць ён любіць яе вышэй за ўсё». У час паўстання 1863 года шляхта Віцебшчыны дэманстравала аналагічную пазіцыю: «З бацькоў і продкаў нашых палякамі з'яўляемся і такімі ў дзецях і нашчадках нашых навечна быць хочам». Невыпадкова падзеі 1863 года ніхто з сучаснікаў нацыянальна-вызваленчым паўстаннем беларускага народа не называў. Як ніхто не называў Вікенція Канстанціна Каліноўскага беларускім нацыянальным героем. Усе сучаснікі скарыстоўвалі зусім іншае азначэнне – польскае паўстанне ў Літве і Беларусі. «Беларусізацыя» Каліноўскага пачалася толькі ў пачатку XX стагоддзя. Таму давайце будзем сумленнымі, прынамсі ў навуковых тэкстах, у дысертацыях, у манаграфіях, у навуковых


MANIFEST RZADU POLSKIEGO.

BOŻE ZBAW POLSKE

Маніфест Часовага ўрада Літвы і Беларусі на польскай мове. Вільня, 1 лютага 1863 года

публікацыях – будзем мець мужнасць сваё назваць сваім, а чужое – чужым.

**– Што ў такім выпадку застаецца са свайго, калі нашы нацыянальныя героі, як высвятляецца, не лічылі сябе беларусамі?**

– Адраджэнскія міфы сыгралі сваю пазітыўную ролю – яны паспрыялі самаўсведамленню беларусаў як асобнай нацыі. «Кароткую гісторыю Беларусі» В. Ластоўскага і «Гісторыю беларускай літаратуры» М. Гарэцкага я сам прачытаў яшчэ ў 1983 годзе, знайшоўшы гэтыя кнігі на гарышчы дома свайго дзеда Івана Марзалюка. Мне было тады 15 гадоў. І да сённяшняга дня памятаю, як гэтыя кнігі паўплывалі на крышталізацыю маёй беларускай нацыянальнай свядомасці. Але сёння ўжо іншы час. Цяпер няма патрэбы крышталізаваць беларускую нацыю, бо яна ўжо рэальна існуе як асобная сацыякультурная і этнічная рэальнасць. І, дарэчы, не так страшна, што існуе беларуская гістарычная міфалогія, бо такая сітуацыя ўласціва і іншым нацыям: гістарычныя міфы найбольш лёгка засвойваюцца і выкарыстоўваюцца на побытавым, абывацельскім узроўні. Міфы, у тым ліку гістарычныя, невынішчальныя, яны заўсёды прысутнічаюць у масавай свядомасці таго ці іншага народа. Скажам, для сярэднестатыстычнага паляка (не гісторыка) менавіта палякі адыгралі вызначальную ролю ў Грунвальдскай бітве. Для літоўца ж, як і для беларуса, усё будзе выглядаць з дакладнасцю наадварот. Але ж прычым тут навука? Прычым тут гісторыя? Страшна, калі асобныя прафесійныя гісторыкі дагэтуль імкнуцца надаць навукападобны статус канцэпцыям і тэорыям, якія ўзніклі ў час станаўлення беларускай нацыі і дзяржавы, былі пакліканы легітымізаваць правы беларусаў на ўласную дзяржаўнасць, але як навуковыя рэканструкцыі ніколі не мелі акадэмічнай вартасці. Напрыклад, літоўскі міф беларускай гістарыяграфіі сёння адыгрывае надзвычай дэструктыўную, разбуральную для грамадскай свядомасці ролю, фарміруе адначасова і комплекс нацыянальнай мізэрнасці, і прагу да рэваншу, «праведны гнеў» на «злодзеяў»-літоўцаў, якія нібыта «ўкралі» ў нас і «нашу» саманазву, і «нашу» дзяржаўнасць, і «нашы» этнічныя тэрыторыі.

**– Якім павінен быць нацыянальны падручнік па гісторыі?**

– Падручнік – гэта заўсёды сімвал веры нацыі ў сваю будучыню, рэлігія яе пачуццяў, калі хочаце. Малады чалавек на ўроках гісторыі Беларусі мусіць вучыцца любові да Айчыны і да сваіх продкаў, мусіць адчуваць сваю адказнасць як грамадзяніна за свой дом і краіну. Нацыянальны падручнік для сярэдняй школы павінен вучыць любіць мінулае Беларусі, павінен ствараць у дзіцяці адчуванне прыналежнасці да беларускага народа, фарміраваць пачуццё нацыянальнай салідарнасці, гонар за сваю мову і краіну. Але пры гэтым і веды трэба даваць па прадмеце ды не апускацца да прамых фальсіфікацый, чужога не красці.



Актывістка Таварыства беларускай культуры. г. Іркуцк, Расія

У Беларусі праведзена вялікая праца па падрыхтоўцы сапраўды нацыянальных падручнікаў па гісторыі. У ёй прымалі ўдзел розныя калектывы вядомых беларускіх навукоўцаў. Безумоўна, не абыходзілася без цяжкасцей, спрэчак, ідэйных сутыкненняў, але для мяне, прынамсі, важны вынік, што атрымаўся: у нас сапраўды ёсць падручнікі, якія можна параіць прачытаць непрафесійным гісторыкам для агульнага развіцця. Сёння сярэднестатыстычны беларус ведае, што вытокі яго народа, дзяржаўнасці – у Полацкім княстве, але найперш – у Вялікім княстве Літоўскім. Як паказваюць сацыялагічныя даследаванні, так лічыць пераважная большасць беларусаў. Нацыянальная свядомасць нашага народа ўмацавалася насуперак тым, хто называе беларусаў цёмнымі ды забітымі. Так што з масавай нацыянальнай і гістарычнай свядомасцю цяпер лепш, чым калі-небудзь раней. І гэта цудоўна. Як нам далей пісаць нашу гісторыю? Чаму вучыць і як вывучаць? Паўтаруся – найперш не хлусіць, не падманваць.

**Гутарыў Віктар КОРБУТ**

*Студзень 2010 года*